дуць ажыццяўляць навігацыю ў электронных адукацыйных рэсурсах, ажыццяўляць іх адбор, размяшчэнне і забеспячэнне да іх доступу шляхам прамога і ўскоснага ўзаемадзеяння на прынцыпах сацыяльнага партнёрства, калектыўнага доступу для бібліятэк-філіялаў і сеткавага прынцыпа арганізацыі такога ўзаемадзеяння.


1. *Антопольский, А.* Принципы формирования системы научной информации в Российской академии образования / А. Антопольский // Информационные ресурсы России. – 2009. – № 4. – Режим доступа: http: www/aselibrary.ru/ digital_resources/journal/irr. – Дата доступа: 17.11.2013.

2. *Козловская, М.* Книжные полки on-line / М. Козловская // Информационные ресурсы России. – 2009. – № 1. – Режим доступа: http:www/ aselibrary.ru/digital_resources/journal/irr. – Дата доступа: 17.11.2013.

3. *Маркарова, Т.* Создание электронных образовательных ресурсов в условиях традиционной отраслевой библиотеки / Т. Маркарова, И. Моисеев, Ю. Агафонов // Информационные ресурсы России. – 2008. – № 2. – Режим доступа: http:www/aselibrary.ru/digital_resources/journal/irr. – Дата доступа: 17.11.2013.

4. *Племнек, А. И.* Методология создания комплексной информационно-библиотечной сети вуза / А. И. Племнек, Н. В. Соколова // НТВ СПбГПУ. – СПб., 2007. – № 4. – Т. 2. – С. 169–176.



***Л. І. Доўнар,** канд. педагагічных навук, дац., дац. каф. тэорыі і гісторыі ІДК БДУКМ*


# БЕЛАРУСКАМОЎНАЯ КНІГА І СУЧАСНАЕ КНІГАВЫДАННЕ БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

Чытанне кніг застаецца важнейшым паказчыкам ўзроўню развіцця культуры і маральна-этычнага стану грамадства. Развіццё сучаснага кнігавыдання Беларусі, беларуская кніга як з'ява ў сусветнай кніжнай культуры патрабуюць пільнага клопату дзяржавы, а таксама адпаведнага навуковага забеспячэння. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў гэтым пытанням надавалася асаблівая ўвага, пра што сведчаць міжнародныя навуковыя форумы і выдадзеныя паводле іх матэрыялы – гэта міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць» (3–4 красавіка 1996 г.), «Беларуская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» (7–8 лютага 2006 г.), Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні і інш. Сведчаннем цікавасці да азначаных пытанняў стала і арганізаваная «Союзом издателей и распространителей печати» (створаны па ініцыятыве Міністэрства інфармацыі ў снежні 2006 г.) Міжнародная штогадовая канферэнцыя выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў кніг і друкаваных СМІ (з 2007 г.). Нарэшце, 7 ліпеня 2013 г. уступіў у сілу і ўпершыню распрацаваны «Закон аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь», які цяпер рэгулюе выпуск, выраб і распаўсюджанне друкаваных выданняў. Аднак праблем, якія патрабуюць не толькі абмеркавання, але і тэрміновага вырашэння, не стала меней, асабліва ў крызісны перыяд (пасля 2008 г.).

Каб яскравай і відавочнай была карціна сучаснага стану беларускамоўнага кнігавыдання звернемся да параўнальнай статыстыкі і адзначым самыя паспяховыя і высокія паказчыкі беларускамоўнага кнігавыдання і наадварот – самыя нізкія:

| Самыя высокія паказчыкі | | Самыя нізкія паказчыкі | |
|---|---|---|---|
| Гады (па дзесяцігоддзях) | Усяго выдадзена (назваў, у %) | Гады (па дзесяцігоддзях) | Усяго выдадзена (назваў, у %) |
| 1929 | 72,5 | 1923 | 12,5 |
| 1930 | 88,4 | 1939 | 50,5 |
| 1945 | 87,6 | 1940 | 48,6 |
| 1954 | 58,4 | 1956 | 37,9 |
| 1968 | 30,8 | 1965 | 15,3 |
| 1970 | 25,3 | 1974 | 14,1 |
| 1988 | 13,7 | 1985 | 11,5 |
| 1993 | 26,9 | 1999 | 10,7 |
| 2004 | 11,2 | 2006 | 7,1 |

Такім чынам, у гісторыі беларускага кнігавыдання самыя высокія паказчыкі зафіксаваны ў 1930 г., калі было выпушчана 88,4 % беларускамоўных выданняў ад усёй колькасці кніжнага рэпертуару, а самы нізкі паказчык, які можна параўнаць толькі з перыдам да 1917 г., з'явіўся ў 2006 г. – 7,1 %. Пасля 1994 г. у кнігавыданні Беларусі штогод назіраецца спад выпуску беларускамоўнай прадукцыі, як па колькасці найменняў, так і па тыражу. Апошняя пазіцыя – гэта характэрная тэндэнцыя для сусветнага кнігавыдання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паводле статыстычных паказчыкаў Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, што адлюстроўваюцца ў штогадовых статыстычных зборніках «Друк Беларусі», удзельная вага беларускамоўных выданняў у агульным кнігавыдавецкім патоку сучаснай незалежнай Беларусі ў сярэднім складае толькі 9 %:

| Гады | На аднаго жыхара, % | Усяго выдадзена | | Беларускамоўныя выданні ад усёй выдадзенай кніжнай прадукцыі | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | колькасць назваў | тыраж млн. экз. | назвы, % | тыраж, % |
| 2010 | 4,5 | 11 040 | 43,1 | 8,6 | 9,3 |
| 2011 | 3,6 | 11 084 | 34,3 | 8,5 | 8,4 |
| 2012 | 3,5 | 11 344 | 33,1 | 9,5 | 9,1 |

Адначасова назіраецца рост малатыражных выданняў (да 500 асобнікаў). У 2012 г. удзельная вага такіх выданняў у агульным тыражы склала 56,4 % (2011 г. – 50,6 %, 2010 г. – 44 %). У агульным патоку выданняў яны складаюць толькі 3 % і амаль палова – гэта літаратура, якая не мае шырокага распаўсюджання: ведамасная, вузаўская, навуковая і інш. вузкага прызначэння.

У 2012 г. кнігі ў Беларусі выдаваліся на 16 мовах народаў свету. Больш за ўсё выпускалася кніг на рускай мове – 84,4 %. Выходзілі таксама кнігі на англійскай, нямецкай, французскай, польскай, іспанскай і іншых мовах.

Як жа выглядае моўная сітуацыя нацыянальнага кнігавыдання ў іншых краінах былога СССР? На гэтае пытанне дапамагае даць адказ падрыхтаваны і выпушчаны ў свет Нацыянальнай кніжнай палатай Беларусі статыстычны зборнік «Печать стран СНГ в цифрах. 2012», які змяшчае статыстычныя дадзеныя кніжных палат Арменіі, Беларусі, Казахстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Украіны. Выданне з'яўляецца першым праектам, рэалізаваным у рамках дзейнасці Савета кіраўнікоў кніжных палат дзяржаў – удзельнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а інфармацыя ў ім differentнабакова характарызуе выпуск у 2012 г. у краінах СНД выдавецкай прадукцыі ў разрэзе колькасці назваў выданняў, тыражу, аб'ёмаў, тэматыкі, відаў і іншага і дае магчымасць аналізаваць і супастаўляць статыстычныя дадзеныя аб выпуску друкаваных выданняў у кожнай з краін. Вынікі за 2012 г. наступныя:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Краіна | Колькасць назваў выданняў на нацыянальнай мове | Колькасць назваў выданняў на рускай мове | Суадносіны колькасці назваў выданняў на нацыянальнай і на рускай мовах |
|---|---|---|---|
| Арменія | 1217 (на армянскай мове) | 143 | у 8,5 раз больш на армянскай мове |
| Казахстан | 2087 (на казахскай мове) | 1568 | у 1,3 разы больш на казахскай мове |
| Малдова | 1875 (на румынскай мове) | 383 | у 5 раз больш на румынскай мове |
| Таджыкістан | 388 (на таджыкскай мове) | 111 | у 3,5 раз больш на таджыкскай мове |
| Украіна | 16342 (на ўкраінскай мове) | 7034 | у 2,3 разы больш на ўкраінскай мове |
| Беларусь | 1073 (на беларускай мове) | 9577 | у 9 раз больш на рускай мове |

Асноўнае месца ў відавой структуры кнігавыдання Беларусі даволі працяглы перыяд займаюць вучэбныя і вучэбна-метадычныя выданні – больш трэці ўсяго аб’ёму выпуска кніг і па колькасці назваў (43,8 %), і па тыражу (47,8 %). Значная доля выпуска належыць літаратурна-мастацкім творам: па колькасці назваў – 17,2 %, па тыражу – 24,1 %. Назіраецца рост перакладаў.

Паступова ў кнігавыданні Беларусі займаюць сваё месца і электронныя выданні. Так, у 2011 г. іх выйшла 438, у 2012 г. – 561 электроннае выданне, асноўную частку якіх складаюць сеткавыя і прыкладна ў тры разы менш – лакальныя на кампакт-дысках. Выпускаюць электронныя выданні крыху больш за 5 % выдаўцоў. Большая частка сеткавых – гэта вучэбныя і метадычныя дапаможнікі (курсы лекцый, практыкумы, метадычныя дапаможнікі, мультымедыйныя прэзентацыі да ўрокаў), якія, звычайна, маюць друкаваныя аналагі і распаўсюджваюцца праз электронна-бібліятэчныя сістэмы ВНУ ці маюць доступ праз Інтэрнэт.

Вядучым кнігавыдавецкім цэнтрам застаецца Мінск, хоць паступова назіраецца тэндэнцыя да павелічэння долі кнігавыдання ў іншых абласных цэнтрах. Так, каля 80 % па назвах і 95 % па тыражу кніжных выданняў належыць Мінску і адпаведна каля 20 % назваў і 5 % тыражу прыпадае на шэсць абласцей Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выдавецкай дзейнасцю ў 2012 г. займаліся 377 выдаўцоў з 618 зарэгістраваных Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (у 2011 г. – 621) – гэта арганізацыі дзяржаўнай, недзяржаўнай і змешанай формаў уласнасці, індывідуальныя прадпрымальнікі, грамадскія і рэлігійныя арганізацыі, адукацыйныя ўстановы. Больш за 50 % складаюць камерцыйныя выдавецтвы і ўнітарныя прадпрыемствы. Застаецца тэндэнцыя рэальнага ўдзелу ў кнігавыданні і фарміраванні кніжнага рынку Беларусі толькі 55–60 % з усіх зарэгістраваных выдаўцоў, сярод якіх у 2012 г. 25 % выпусцілі ўсяго 1–2 кнігі за год. У большасці імі з'яўляюцца арганізацыі, у працы якіх выдавецкая дзейнасць выступае спадарожным працэсам іх асноўных кірункаў: адукацыйнага, рэкламнага, вытворчага.

Вядучыя пазіцыі ў рэйтынгу выдаўцоў займае (з 1996 г.) беларускае выдавецтва «Харвест», доля якога ў сукупным тыражы застаецца стабільна высокай – больш за 40 %. На працягу многіх гадоў утрымліваюць у рэйтынгу свае пазіцыі і наступныя выдаўцы – «Аверсэв», «Попурри», «Народная асвета», «Белый ветер» (Мазыр), некаторыя ВНУ. Сярод выдаўцоў электронных выданняў вылучаецца мінскае выдавецтва «Ковчег», доля электроннай прадукцыі якога займала ў 2011 г. 33 %, у 2012 г. – 62 %.

Сусветныя тэндэнцыі пераарыентацыі чытачоў не толькі на электронныя кнігі, якія чытаюцца з дапамогай е-рыдэраў, але і на смартфоны і планшэты, з цягам хуткаплыннага часу прынясуць змены і на кніжны рынак Беларусі, які будзе імкнуцца задавальняць попыт спажыўцоў. Адначасова ў цяперашняй беларускай сітуацыі паслядоўная дзяржаўная падтрымка можа забяспечыць беларускамоўным выданням максімальнае спрыянне. Сёння ж неабходна выкарыстоўваць усе рэсурсы і тэхналогіі для развіцця беларускамоўнага кнігавыдання і грамадства дзеля набыцця ведаў і захавання непаўторнай і самабытнай беларускай культуры і мовы.

---

*1.* Друк Беларусі, 2010 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка. – Мінск : НКП Беларусі, 2011. – 80 с.

*2.* Друк Беларусі, 2011 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка. – Мінск : НКП Беларусі, 2012. – 72 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3.* Друк Беларусі, 2012 : статыстычны зборнік / Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная кніжная палата Беларусі ; склад. Т. Р. Рабушка; пад агул. рэд. А. В. Івановай. – Мінск : НКП Беларусі, 2013. – 76 с.

*4.* Печать стран СНГ в цифрах, 2012. Статистические данные книжных палат Армении, Беларуси, Казахстана, Молдовы, России, Таджикистана, Украины / Совет руководителей книжных палат государств-участников Содружества Независимых Государств ; [сост. Т. Г. Рабушко ; под общ. ред. Е. В. Ивановой]. – Минск : НКП Беларуси, 2013. – 32 с.

***В. І. Саітава****, канд. педагагічных навук, дац.,*
*дац. каф. тэорыі і гісторыі ІДК БДУКМ*

# СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ АДУКАЦЫІ Ў БІБЛІЯТЭКАХ УВА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Рэспубліцы Беларусь дзейнічае 54 установы вышэйшай адукацыі, якія забяспечваюць падрыхтоўку высока кваліфікаваных спецыялістаў для галін эканомікі, навукова-педагагічнай дзейнасці і іншых сфер нашай і дзесяткаў замежных краін. Бібліятэкі УВА забяспечваюць інфармацыйную падтрымку дзейнасці вышэйшай школы па прадстаўленні якасных адукацыйных паслуг, развіццю навуковых даследаванняў, фарміраванню інтэлектуальна і духоўна развітай асобы студэнта. Інфарматызацыя вышэйшай адукацыі, грамадства ў цэлым, для розных сфер і абласцей якога рыхтуюцца спецыялісты, ставіць перад бібліятэкамі УВА пытанні ўдасканалення бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк УВА на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў трансфарміруецца пад уплывам інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, але захоўвае і традыцыі. Аднак галоўныя набыткі бібліяграфічнай дзейнасці гэтых бібліятэк звязаны з лічбавымі тэхналогіямі і перспектыўныя кірункі яе развіцця прасочваюцца ў тэндэнцыях бібліяграфічнай практыкі бібліятэк перадавых універсітэтаў свету.

Напрамкі, па якіх вядзецца бібліяграфічная дзейнасць бібліятэк высокарэйтынгавых універсітэтаў, шырока асветлены. Вызначаны прыярытэты бібліятэк: развіццё ўнікальных лічбавых